# СТРУКТУРНА-СІНТАКСІЧНЫЯ МАДЫФІКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ: ТЫПАЛАГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

**Чайка Наталля Уладзіміраўна**
дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ўстановы адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Мінск, Беларусь)

Сярод актуальных праблем сучаснага мовазнаўства праблема тыпалагічнага апісання адзінак дынамічнага сінтаксісу – парцэляцыі, кампрэсіі, рэдукцыі, эліпсіса, сінанімічных сінтаксічных пераўтварэнняў, імплікацыі і інш. – з’яўляецца адной з цэнтальных у айчыннай і замежнай навуцы. Такая цікавасць да праблемы з боку айчынных і замежных вучоных тлумачыцца неабходнасцю даследаваць і ўпарадкаваць з’явы дынамічнага сінтаксісу, якія апошнім часам набылі рэгулярны і стабільны характар. Зразумець спецыфіку іх структурнай і семантычнай арганізацыі і заканамернасці функцыянавання ў поўным аб’ёме магчыма выключна з выкарыстаннем вытлумачальнага патэнцыялу тыпалагічнай характарстыкі аб’екта і метадалогіі, якая выяўляла б сутнасць і прыроду сінтаксічнай з’явы.

Праблема структурна-сінтаксічных мадыфікацый на працягу гісторыі мовазнаўства выступала як адна з найбольш актуальных, пра што сведчыць нязменная цікавасць да яе з боку прадстаўнікоў розных сінтаксічных школ і напрамкаў: *логіка-граматычнай сінтаксічнай* школы [М.І. Грэч, Ф.І. Буслаеў і інш.], *псіхалагічнай школы ў сінтаксісе* [Т.Ф. Дубоўцава, Н.А. Назараў, М.Л. Макараў, Т.М. Сакалова і інш.], *структурнай школы*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[А.М. Мухін, Т.Д. Шабанова, А.У. Грудзева, M. Wiśniewski, J. Harma і інш.], *семантычнай сінтаксічнай школы* [Ш. Балі, Т.А. Коласава, Я.У. Лісочанка, С.С. Дзікарова, Е.Н. Радчыкава, B. Hausperger, Z. Vychodilová, A. Unizewska і інш.], *функцыянальнай сінтаксічнай школы* [П.А. Лекант, Г.А. Золатава, І.Ф. Вардуль, K. Carlson і інш.]. Аналізавалася з'ява дынамічнага сінтаксісу ў адпаведнасці з метадалагічнымі прынцыпамі і тэарэтычнай базай канкрэтнай сінтаксічнай школы.

Відавочна, што ў шматлікіх працах назапашаны багаты тэарэтычны і фактычны матэрыял. Пры гэтым неабходна адзначыць, што з'явы дынамічнага сінтаксісу даследавалія выключна ў адпаведнасці з тэорыяй і метадалогіяй статычнага сінтаксісу. Структурна-сінтаксічныя мадыфікацыі ў структурным і семантычным плане праектаваліся на розныя віды статычных сінтаксічных адзінак і кваліфікаваліся ў адпаведнасці з наступнымі крытэрыямі: развітыя – неразвітыя, адна- – двухсастаўныя, простыя – складаныя, што прывяло да неадназначнасці ў трактоўцы аналізуемых з'яў. Прафесар І.І. Дзягавец адзначаў, што наўрад ці якая-небудзь моўная праблема абмяркоўвалася ў навуцы так доўга і так бурна, як праблема мадыфікацый сінтаксічных адзінак. Над рашэннем гэтай праблемы білася не адно пакаленне айчынных, а таксама і замежных сінтаксістаў. Аднак і на сёння яна не толькі не вырашана, але і заблытана да такой ступені, што практычна нельга адмежаваць зыходны сказ ад мадыфікацыі, абапіраючыся на тыя лінгвістычныя крытэрыі, якія прапануюцца сінтаксістамі.

Падобная неадназначнасць у трактоўцы з'яў дынамічнага сінтаксісу, стракатасць і супярэчлівасць канцэпцый абумоўлена тым, што існуючыя ў сучасным мовазнаўстве метадалагічныя прынцыпы і тэарэтычная база не адпавядаюць сутнасці з'яў дынамічнага сінтаксісу, яны прыдатны для аналізу выключна статычных сінтаксічных адзінак. Таму, на наш погляд, наспела неабходнасць якасна новага падыходу да аналізу дынамічных сінтаксічных працэсаў, які адпавядаў бы накіраванасці навуковага пазнання новага часу, які выяўляў бы сутнасць сінтаксічных з'яў і заканамернасці іх функцыянавання з улікам антрапацэнтрычнага характару сучасных моўных працэсаў.

Актуальнасць даследавання структурна-сінтаксічных мадыфікацый абумоўлена неабходнасцю:

– распрацаваць метадалагічныя прынцыпы і тэарэтычную базу для аналізу і сістэматызацыі адзінак дынамічнага сінтаксісу;

– выявіць фактары, што выступаюць кваліфікацыйнымі, класіфікацыйнымі і сістэмаўтваральнымі для адзінак дынамічнага сінтаксісу;

– сістэматызаваць механізмы эксплікацыі семантыкі і граматычных значэнняў у структурна-сінтаксічных мадыфікацыях.

Паколькі мадыфікаваныя сказы ўяўляюць асобы тып сінтаксічных адзінак са спецыфічнай, уласцівай толькі ім структурнай і семантычнай

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

арганізацыяй, са сваёй сістэмай сродкаў выражэння прэдыкатыўных катэгорый, то яны павінны выступаць самастойным аб'ектам даследавання ў сінхронным тыпалагічным аспекце. Існуючыя канцэпцыі сінтаксічных тыпалогій як параўнальныя, так і замкнёных сістэм заснаваны на характары тыпалагічнага падабенства класа аб'ектаў. Асноўныя метадалагічныя прынцыпы тыпалагічнага мовазнаўства можна класіфікаваць наступным чынам:

– прынцып сістэмнасці тыпалагічнага падабенства (А.Я. Кібрык, І.П. Мельнікаў, Н.Б. Мячкоўская);

– прынцып тыпалагічнай значымасці прыкмет (параметраў) (А.Я. Кібрык, І.П. Мельнікаў і інш.);

– прынцып іерархіі аб'ектаў (ад універсальных да ўнікальных уласцівасцей) (А.У Цымерлінг);

– прынцып абумоўленасці тыпалагічна значымых прыкмет ступенню распаўсюджанасці (Н.Б. Мячкоўская);

– прынцып сінтагматыка-парадыгматычнага функцыянальнага ўзгаднення (А.Я. Кібрык).

Аднак тыпалогія канструкцый дынамічнага сінтаксісу ў названых працах не даследавалася, а значыць патрабуе вывучэння.

У аснову метадалогіі даследавання адзінак дынамічнага сінтаксісу лічым мэтазгодным пакласці прынцып сістэмнасці функцыянальна тоесных прыкмет.

Лічым, што для аналізу і ўпарадкавання стуктурна-сінтаксічных мадыфікацый неабходна пабудаваць кампенсаторную сінтаксічную тыпалогію ўсіх адзінак дынамічнага сінтаксісу ў беларускай мове, распрацаваць тэарэтычныя асновы кампенсаторнай сінтаксічнай тыпалогіі, вылучыць структурныя тыпы сінтаксічных мадыфікацый, выявіць іх семантычныя тыпы і структурную арганізацыю.

У якасці тыпалагізацыйнага параметра лічым мэтазгодным выкарыстоўваць кампенсаторную прыкмету – паняцце, што характарызуе спосаб замяшчэння семантыкі і прэдыкатыўных значэнняў у мадыфікаваных канстукцыях з дапамогай рознаўзроўневых моўных адзінак. Яна выступае ў якасці інструмента пазнання сутнасці сінтаксічнай з'явы, выяўлення заканамернасцей функцыянавання сінтаксічных адзінак і моўных механізмаў, што іх рэгулююць.

Кампенсаторнай прыкмеце ўласцівы ўніверсальнасць, кваліфікацыйны характар і інтэгральная функцыя. Кампенсаторная функцыя розных кампанентаў выступае абагульненай тыпалагізуючай прыкметай і ўключае структурныя элементы прыватнага характару – параметры структурнай, граматычнай і семантычнай тыпалогіі. Напрыклад, кампенсацыя сэнсу ў канструкцыі ***Сонцу*** ***–*** *высь і чыстыя нябёсы, //* ***Кветцы*** ***–*** *май і свет-*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*лая раса, // **А дзяўчыне –** хустачка на косы – // Лепшая аздоба і краса* (А. Пысін) ажыццяўляецца з дапамогай кампанента семантычнай структуры – рэцыпіента – *сонцу, кветцы, дзяўчыне,* які ўказвае на семантыку непераўтваральнага ўздзеяння. Маркіроўка прэдыкатыўных значэнняў ажыццяўляецца сродкамі розных моўных узроўняў – сінтаксічнага (значэнне прошлага часу): ***Падышоўшы непрыкметна да веснічак**, Міхал – праз вакно ў хату* (Б. Сачанка), марфалагічнага: *Я – **толькі** з начной. Хачу адпачыць* (А. Дзялендзік). Дыферэнцыяльная функцыя тыпу прэдыката ажыццяўляецца і шляхам адмежавання семантычнай функцыі сінтаксемы: *Рыбу звычайна ловяць сеткамі. Ракаў – **кошыкамі*** («Браслаўская звязда»); *А ракаў у нас – **кошыкамі!** Табе тут спадабаецца* (А. Дзялендзік). У першым выпадку прэдыкат акцыянальны, на што ўказвае медыятыў *кошыкамі,* у другім выпадку характарызуючы квантытатыўны вытворны прэдыкат. Відавочна, што кампенсаторная прыкмета абагульняльнага характару ўключае паняцці канкрэтызуючага характару, якія сістэматызаваны ў адпаведнасці з моўнымі механізмамі, што рэгулююць іх функцыянаванне, з моўнымі ўзроўнямі, да якіх адносяцца кампенсаторныя сродкі, і ступенню частотнасці з'яў – ад універсальных да ўнікальных. Такім чынам, кампенсаторная прыкмета абагульняльнага характару ўключае структурныя кампаненты канкрэтызацыйнага характару: параметры тыпалогііі структурнай, семантычнай арганізацыі і спосабаў выражэння прэдыкатыўных катэгорый.

У адпаведнасці з прыналежнасцю да пэўнага моўнага ўзроўню вылучаны: кампенсаторныя кампаненты ўзроўню сінтаксічнай, семантычнай арганізацыі, марфалагічнага, лексічнага, фанетычнага ўзроўню.

У залежнасці ад функцыянальнай прыналежнасці кампенсаторныя кампаненты можна класіфікаваць наступным чынам: кампенсаторныя кампаненты, што маркіруюць семантыку і граматычныя значэнні эліптычнай канструкцыі.

У залежнасці ад функцыянальнага дыяпазону кампенсаторныя кампаненты падзяляюцца на: канстантныя, монафункцыянальныя, поліфункцыянальныя.

Разам з тым паўстае пытанне: што можна лічыць тыпам? Якія тыпы структурна-сінтаксічных мадыфікацый можна вылучыць і на аснове якіх прыкмет?

Тып, на наш погляд, выступае своеасаблівай мадэллю адносін паміж структурнай арганізацыяй эліптычнай канструкцыі і кампенсаторным кампанентам (калі гэта структурная тыпалогія), паміж тыпам прэдыката і паказчыкам семантыкі (калі гэта тыпалогія семантычнай арганізацыі) і паміж прэдыкатыўным значэннем і спосабамі і сродкамі іх экспплікацыі (калі гэта тыпалогія граматычнай арганізацыі). Названая мадэль адносін прыдатная для выяўлення не толькі спецыфічных асаблівасцей канструкцый з эліпсісам дзеяслова, а і заканамернасцей іх функцыянавання.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Напрыклад, маркіроўка семантыкі пераўтваральнага ўздзеяння адбываецца на аснове паясняльных адносін і анафарычнай пераемнасці кампанентаў паміж прэдыкатыўнымі часткамі: ***Хвартухоў** у бабкі – розна, вышываных, // Белых, ясных, сініх, дарагіх і танных: // **Гэтыя – на будзень, тыя – пад кудзелю, // Гэтыя – ў гасціну, тыя – на нядзелю*** (Л. Геніюш). Сінтаксічная сувязь паміж прэдыкатыўнымі часткамі бяззлучнікавая гіпатаксічная, якая выражаецца імпліцытна (адсутнасць злучніка), значыць, падобны тып кваліфікуецца намі як поліпрэдыкатыўны імпліцытна-гіпатаксічны.

Аналагічным чынам выражае адносіны паміж тыпам прэдыката і паказчыкам семантыкі тыпалогія семантычнай арганізацыі канструкцый з эліпсісам дзеяслова. Акцыянальна-безаб`ектны тып указвае на тып прэдыката (акцыянальны) і на тое, што дзеянне не накіравана на аб`ект: *Радуйся, што сэрца — на шматкі... Ад надрыўных думак і дыхання* (Р. Баравікова). Лакатыўна-пацыентыўны тып указвае на тое, што кампенсаторным кампанентам тут выступае пацыентыў, а сам сказ мае семантыку перамяшчэння: *Як з хваробы я ачнуўся, // Дзе ляжаць? Адказны год! // У Маскву мяне на курсы камандзіраў — // І на фронт* (П. Броўка).

Адразу ўзнікае пытанне: чым адрозніваецца, напрыклад, лакатыўны тып эліптычных канструкцый і тып з семантыкай руху поўных канструкцый, калі яны ўказваюць на семантыку руху? А адрозніваюцца яны тым, што эліптычныя канструкцыі не могуць рэалізаваць семантыку руху без указання на канечны, пачатковы пункт і інш. у сказах тыпу ***Мы едзем.*** Для рэалізацыі семантыкі руху ў аналізуемых канструкцыях патрабуецца кампанент лакатыўнага тыпу *Мы – **у школу,*** таму лічым мэтазгодным падобныя сказы кваліфікаваць як дынамічна-лакатыўны тып. Калі б мы такія сказы кваліфікавалі як тып з семантыкай руху, то наша тыпалагічная характарыстыка была б недакладнай, бо відавы клас семантыкі руху ў канструкцыях з эліпсісам дзеяслова значна вузейшы, чым у поўных канструкцыях. Гэта датычыцца і іншых семантычных тыпаў.

Эліпсіс дзеяслова робіць немагчымым рэалізаваць некаторыя віды семантыкі нязменнага стану тыпу *Маці – настаўніца*, што абумоўлена спосабам выражэння прэдыкатыўнага кампанента. Такая семантыка можа рэалізавацца ў канструкцыях толькі пры ўмове сінанімічных пераўтварэнняў тыпу *Сцяпан – у салдатах,* або фазіснай мадыфікацыі праявы стану: *Чаго вы – з камсамола?* (М. Зарэцкі); *Так і ў запас нядоўга.* (Я. Крупенька).

Не прадстаўлена ў канструкцыях з эліпсісам дзеяслова ні адна з разнавіднасцей семантыкі актыўнага дзеяння, не звязанага непасрэдна з аб`ектам, тыпу *настаўнічаць, сталярнічаць*. Працяглае актыўнае дзеянне функцыянальна набліжаецца да семантыкі стану, а гэта значыць у мадэлі будуць адсутнічаць аб`ектныя кампаненты, што выступаюць асноўнымі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

паказчыкамі семантыкі. Семантыка актыўнага дзеяння можа быць прадстаўлена ў канструкцыях з эліпсісам дзеяслова выключна пры ўмове, калі ёсць кампаненты, што ўказваюць на спосаб або на час працякання працэсу, яны і змяшчаюць прамое ўказанне на адпаведную семантыку: *Падкраўшыся да вёскі, ён (лівень) з нізкай хмары – на двор з гвалтоўным шумам* (Янка Брыль); *Не надта шумі, старшыня. Я – па заданні райкама* (А. Макаёнак).

Тое самае датычыцца і структурнай тыпалогіі. Калі б мы, напрыклад, характыразавалі эліптычныя канструкцыі ў адпаведнасці з метадалогіяй структурнага сінтаксісу, то ў нас атрымаліся б тыпы, што прадстаўлены ў класічных граматыках, як прыклад, ускладненыя, простыя, складаныя. Аднак эліпсіс дзеяслова немагчымы ў канструкцыях з пералічальна-размеркавальнымі адносінамі тыпу *То ідзе снег, то лье дождж.* Пры эліпсісе дзеяслова ў адносіны пералічальна-размеркавальныя ўступаюць суб`ектныя кампаненты і сказ мяняе структуру: *То снег, то дождж* або *То снег ідзе, то дождж.*

Не рэалізуецца кампенсаторная функцыя і пры супраціўных сінтаксічных адносінах: *Багач ззяе ў пазалоце, мужык бедны мрэ ў бядноце* (Якуб Колас). Пры эліпсісе дзеяслова нейтралізуюцца сінтаксічныя сувязі і адносіны і ўзаемадзейнічаць пачынаюць дадаными члены сказа. А калі ўлічыць той фактар, што многія кампаненты характарызуюцца поліфункцыянальнасцю, то пры эліпсісе дзеяслова сказ набывае структурна-сэнсавую неадназначнасць. Канструкцыю з прапушчаным дзеясловам *Багач – у пазалоце, мужык – у бядноце* можна кваліфікаваць і як эліптычную, і як поўную вытворную з прэдыкатыўнымі кампанентамі *ў пазалоце, у бядноце.*

Супраціўныя адносіны рэалізуюцца выключна пры ўмове, калі паміж сабой узаемадзейнічаюць кампаненты з рэферэнтным значэннем: *Я – у атрад, а ты ж, мабыць, да немцаў? – сказаў Война і сцюдзёнымі вачамі ўставіўся ў Сушчэню* (В. Быкаў) або ў канструкцыях з іменным прэдыкатам: *Вы, грамадзянін Секержыцкі, разумны, інтэлегентны чалавек, і раптам такое?* (М. Матукоўскі).

Кампенсаторная функцыя не рэалізуецца пры атрыбутыўнай сінтаксічнай сувязі па прычыне адсутнасці ўзаемадзеяння з выказнікам: *За лесам – возера, празрыстае і халоднае* (Янка Брыль).

Не рэалізуецца кампенсаторная функцыя і ў канструкцыях з сінтаксічнай сувяззю пераз`яднання. Гэта абумоўлена абсалютнай семантычнай аднапланавасцю і лагічнай адназначнасцю выказнікаў і залежных ад іх акалічнасцей. Таму пры эліпсісе дзеяслова ў падобных канструкцыях пачынаюць узаемадзейнічаць не выказнікі, а дадаными члены сказа. Напрыклад, у сказе тыпу *Мы паедзем у лес або пойдзем на рыбу* пры эліпсісе



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дзеяслова сінтаксічная пазіцыя аднароднага выказніка нейтралізуецца і ў адносіны аднароднасці ўступаюць акалічнасці: *Мы – у лес або на рыбу.*

Пералічальна-размеркавальныя адносіны магчымыя толькі ў канструкцыях з семантычнай і сінтаксічнай аднапланавасцю: *І немагчыма ўжо назад, // І немагчыма ўжо на месцы* (А. Разанаў).

Прэдыкатыўныя катэгорыі таксама выражаюцца спецыфічнымі спосабамі, істотна адрозніваюцца ад спосабаў іх выражэння ў канструкцыях з экспліцытна выражаным дзеяслоўным выказнікам і абумоўлены рознымі фактарамі.

Відавочна, што прыцягненне кампенсаторнай прыкметы ў якасці кваліфікацыйнага і класіфікацыйнага параметра абмяжоўвае сістэму эліптычных канструкцый выключна спецыфічнымі для іх тыпамі і відамі ўнутры класа аб'ектаў дынамічнага сінтаксісу.

Важным складаючым распрацаванай намі метадалогіі выступае спосаб сістэматызацыі і ўпарадкавання сінтаксічных аб'ектаў. *Тыпалагічна істотныя прыкметы дазваляюць аб'яднаць сінтаксічныя з'явы ў тыпы, відавыя класы і ў кантынуум кампенсаторных элементаў, асновай якіх выступае характар сістэматызацыі аб'ектаў – сістэмны або атамарны (Н.Б. Мячкоўская, А.Е. Кібрык, І.П. Мельнікаў). Кантынуум* кампенсаторных элементаў захоўвае асноўныя ўласцівасці класічных кантынуумаў – матэматычных мностваў, хімічных элементаў і інш. – прынцыпы непарыўнасці, магутнасці і суадноснай функцыянальнай тоеснасці часткі – цэлага (кантынуум – элемент); з'яўляецца трохмерным: *сістэматызацыя элементаў у ім ажыццяўлялася з улікам натупных параметраў: моўнага ўзроўню, да якога адносіцца кампанент, моўнага механізму што рэгулюе кампенсаторную функцыю дадзенага элемента, і колькаснага параметра – ступені праявы кампенсаторных уласцівасцей – ад універсальных да ўнікальных.*

Распрацаваная намі метадалогія прыдатная для аналізу і наступных з'яў дынамічнага сінтаксісу – сінтаксічнай рэдукцыі, сінтаксічнай кампрэсіі, сінанімічных пераўтварэнняў, парцэляцыі, семантычнай імплікацыі. Аналіз і сістэматызацыя названых з'яў на сённяшні дзень ажыццяўляецца на аснове метадалагічных прынцыпаў пераважна структурнага і семантычнага сісінтаксісу, і адпаведна класіфікацыя будуецца на аснове базавых характарыстык статычных сінтаксічных адзінак.

Узяўшы за аснову кампенсаторную прыкмету, можна было б выявіць спецыфічныя асаблівасці кожнай адзінкі дынамічнага сінтаксісу. Напрыклад, кваліфікацыя і класіфікацыя вытворных сінтаксічных канструкцый ажыццяўляецца на сённяшні дзень на асннове характару пераўтварэння – наміналізуючая канструкцыя са зменай класа слоў або без змены класа слоў і інш. Аднак кампенсаторным кампанетам тут выступае трансфармацыйная парадыгма, таму і сістэматызацыю лічым мэтазгодней



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

праводзіць у адпаведнасці з гэтай прыкметай. За аснову тыпалогіі вытворных канструкцый, на наш погляд, павінен узяцца характар сінтаксічнай сувязі – канстантны або пераменны. Таксама важным параметрам выступае функцыя кампанента – рэляцыйная або прэдыкатыўная. На аснове такіх параметраў канструкцыю *Сцяпан* – ***у салдатах**. Тры гады ўжо* (З. Бядуля) можна кваліфікаваць замест традыцыйнай, наміналізуючы без змены класа слоў, як канстантна-непераўтваральную прэдыкатыўную, а канструкцыю *То баль, то –* ***у пострыг**. Гэта несур'ёзна* (Р. Баравікова) як канстантна-пераўтваральную прэдыкатыўную, канструкцыю ***У позірках*** *– і радасць, і вясна* (Я. Брыль) пераменна-пераўтваральную рэляцыйную. Такая класіфікацыя, на наш погляд, выкрывае механізмы кампенсацыі семантыкі, выяўляе сутнасць сінтаксічнай з'явы і адпаведна ахоплівае ўсе сінанімічныя сінтаксічныя пераўтварэнні і перафразіроўкі.

Канструкцыі з імпліцытнай семантыкай таксама могуць атрымаць кваліфікацыю ў адпаведнасці з кампенсаторнай прыкметай. Паколькі імпліцытную семантыку канструкцыя набывае ў выніку логіка-семантычных адносін паміж кампанентамі звышфразавага адзінства, значыць, іх і трэба разглядаць у якасці спосабаў кампенсацыі сэнсу.

На наш погляд, у аснову класіфікацыі падобных з'яў замест традыцыйнага *імпліцітны станоўчы-адмоўны сэнс* неабходна пакласці від логіка-семантычных адносін, што выконвае кампенсаторную функцыю. Напрыклад, канструкцыю тыпу *– Вольга, мы будзем вянчацца? –* ***Ты забыўся, што я камсамолка!*** можна кваліфікаваць як адмоўна-прычынны тып на той падставе, што імпліцытную семантыку адмоўя канструкцыя набывае ў выніку пэўнай лагічнай аперацыі.

У дадзеным выпадку канструкцыя *Ты забыўся, што я камсамолка!* змяшчае прычыну ў дачыненні да прамой семантыкі – адмоўя: *Мы вянчацца не будзем. Прычына таму наступная –* ***я камсамолка.*** Падобныя канструкцыі могуць змяшчаць пасылку ў дачыненні да адмоўя, і таму кваліфікацыя іх павінна быць адпаведнай – адмоўна-пасылкавы тып: *Вы так позна з універсітэта?* ***– У нас канікулы.*** Лічым, што падобны падыход зможа даць вычарпальную характарыстыку канструкцыям з імпліцытнай семантыкай і выявіць заканамернасці іх функцыянавання.

Функцыянаванне канструкцый з сінтаксічнай кампрэсіяй тыпу *кава з Бразіліі* або *Малюнак на паперы* ці з сінтаксічнай рэдукцыяй тыпу *Фірма гарантуе. Тэма хвалюе* таксама, на наш погляд, абумоўлена наяўнасцю кампенсаторнага кампанента. У якасці названага кампанента пры сінтаксічнай рэдукцыі можа выступаць парцэляваная канструкцыя, напрыклад: *Вядуць па жытняй сцяжынцы.* ***Чатырох. Пад канвоем. З дому*** (А. Куляшоў) або *Трэба Сашу папярэдзіць.* ***Каб не схапілі яе*** (І. Шамякін). У такім выпадку тыпалагічна

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

істотнай прыкметай будзе выступаць спосаб кампенсацыі сэнсу, у дадзеным выпадку прыналежнасць кампенсаторнага кампанента да пэўнага моўнага ўзроўню – структурнага або семантычнага. Такім чынам, кампенсаторны кампанент у парцэляванай канструкцыі тыпу *Пішу.* ***Пісьмо бацькам*** суадносіцца з кампанентам семантычнай структуры сказа – аб'ектывам, у парцэляванай канструкцыі тыпу *Папярэдзьце рабочых.* ***Каб заўтра выйшлі на працу*** – са структурным кампанентам.

Таму і кваліфікаваць іх неабходна адпаведным чынам – тып з аб'ектным кампенсаторным кампанентам (1) і тып з аб'ектнымі адносінамі (2). Прапанаваны намі падыход дазволіць упарадкаваць адзінкі дынамічнага сінтаксісу на аснове агульнай прыкметы – кампенсаторнай.

Кампенсаторная прыкмета з'яўляецца сістэмаўтваральным параметрам пры пабудове структурнай і семантычнай тыпалогіі ўсіх структурна-сінтаксічных мадыфікацый беларускай мовы.

**Літаратура**


1. Буслаев, Ф. И. Историческая грамматика русского языка : в 2 ч. / Ф. И. Буслаев. – 5-е изд. – М. : Кн. магазин насл. бр. Салаевых, 1881. – Ч. 2. – 394 с.
2. Греч, Н. И. Практическая русская грамматика / Н. И. Греч. – 2-е изд., испр. – СПб. : Тип. изд., 1834. – 2, VIII, 526 с.
3. Грудева, Е. В. Валентностный класс глаголов и эллипсис приглагольных актантов в современном русском языке : эксперим. и корпус. исслед. / Е. В. Грудева // Мир рус. слова. – 2008. – № 4. – С. 22–29.
4. Дикарева, С. С. Системная обусловленность имплицитных смыслов текста / С. С. Дикарева // Исследования по семантике : сб. науч. ст. / Симфероп. гос. ун-т ; редкол.: О. М. Соколов (отв. ред.) [и др.]. – Симферополь, 1987. – С. 84–90.
5. Дубовцева, Т. Ф. Опыт психолингвистического подхода к описанию эллипсисов в русской и английской речи / Т. Ф. Дубовцева // Психолингвистические исследования значения слова и понимания текста : межвуз. темат. сб. науч. тр. / Калин. гос. ун-т ; редкол.: А. А. Залевская (отв. ред.) [и др.]. – Калинин, 1988. – С. 147–152.
6. Дяговец, И. И. Типология русских придаточных предложений нетипичного построения: синтаксические единицы с отклоняющейся структурой : автореф. дис. … д-ра филол. наук : 10.02.01 / И. И. Дяговец ; Моск. гос. ун-т. – М., 2006. – 30 с.
7. Золотова, Г. А. К вопросу о неполных предложениях / Г. А. Золотова // Русский язык : сб. тр. : посвящ. памяти д-ра филол. наук, проф. Николая Николаевича Прокоповича / Моск. гос. пед. ин-т ; редкол.: Л. Ю. Максимов [и др.]. – М., 1975. – С. 106–118.
8. Кибрик, А. Е. Константы и переменные языка / А. Е. Кибрик ; Моск. гос. ун-т, филол. фак. – СПб. : Алетейя, 2005. – 719 с.
9. Лекант, П. А. К проблеме неполных предложений в русском языке / П. А. Лекант // Учен. зап. / Моск. обл. пед. ин-т. – М., 1963. – Т. 139, вып. 9 : Русский язык и литература. – С. 43–49.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

10. Мельников, Г. П. Системная типология языков: принципы, методы, модели / Г. П. Мельников ; Рос. акад. наук, Ин-т языкознания. – М. : Наука, 2003. – 393 с.
11. Мечковская, Н. Б. Социальная лингвистика : пособие для гуманит. вузов и лицеев / Н. Б. Мечковская. – 2-е изд., испр. – М. : Аспект Пресс, 1996. – 206 с.
12. Скovородников, А. П. О неполноте эллиптических предложений (в ас-пекте их синтагматики и парадигматики) / А. П. Скворoдников // Системный анализ значимых единиц русского языка: синтаксические структуры : межвуз. сб. / Красноярск. ун-т ; редкол.: В. А. Белошапкова (науч. ред.) [и др.]. – Красноярск, 1984. – С. 21–30.
13. Циммерлинг, А. В. Типологический синтаксис скандинавских языков / А. В. Циммерлинг. – М. : Яз. славян. культуры, 2002. – 895 с.
14. Bednarczuk, L. Elipsa a spojnosc tekstu / L. Bednarczuk // Składnia, stylystyka, struktura tekstu / pod red. M. Krauz, K. Ozoga ; Uniw. Rzeszowski. – Rzeszow. 2002. – S. 42–45.
15. Corr, A. Ellipsen : Untersuchungen zu Elliptizitat und elliptischen Sprachgebrauch / A. Corr. – Saarbrucken : Verl. Dr. Muller, 2008. – 102 S.
16. Frazier, L. Focus and VP ellipsis / L. Frazier, C. Clifton, K. Carlson // Language a. Speech. – 2007. – Vol. 50, № 1. – P. 1–21.
17. Jaworski, J. Elipsa jako srodek stylistyczno-skladniowy w tekstach publicystycznych konca XVIII wieku / J. Jaworski // Filologia Polska. – 2007. – T. 3. – S. 31–46.
18. Merchant, J. Fragments and ellipsis / J. Merchant // Linguistics a. Philosophy. – 2004. – Vol. 27, № 6. – P. 661–738.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова